# ГЛЕБ ГЕОРГІЕВІЧ ДАМІНІКОЎСКІ (ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



Глеб Георгіевіч нарадзіўся 31 жніўня 1934 г. у прыгарадзе г. Мінска (р-н Козырава). Пасля заканчэння школы № 15 у 1952 г. ён спачатку паступіў у Політэхнічны інстытут, але ўжо пасля першага курса, зразумеўшы, што гэта не кранае яго жыццёвых інтарэсаў, пакідае яго. У 1953 г. Глеб Георгіевіч нанова паступае ў Беларускі дзяржаўны універсітэт на геолага-геаграфічны факультэт, дзе з задавальненнем займаецца асваеннем прафесіі геолага. У 1957 г. выдатна абараніў дыпломную працу і атрымаў спецыяльнасць «геалогія і разведка карысных выкапняў» і званне інжынера геолага-разведчыка.

Далей інтарэсы і любоў да Паўднёвага Уралу прывялі Глеба Георгіевіча на працу ў Ільменскі мінералагічны запаведнік імя У. Леніна, дзе ён прапрацаваў 9 гадоў. Спачатку маладым навуковым супрацоўнікам, а апошнія 1964–1966 гг. – вучоным сакратаром запаведніка. Глеб Георгіевіч прымаў актыўны ўдзел у рабоце геалагічнай групы запаведніка, якая займалася вывучэннем Ільменагорска-Вішневагорскага комплексу і праводзіла геалагічную здымку ў маштабе 1:10 000. Ім выконваўся вялікі аб'ём работ па дакументацыі апорных разрэзаў, зборы каменнага матэрыялу і яго апрацоўцы. У выніку была створаная сыстэматызаваная характарыстыка ўсіх тыпаў парод у іх стратыграфічнай паслядоўнасці. Па Ільменах Глебам Георгіевічам надрукавана сем прац, тры з якіх – сумесна з геолагамі А. Бажэнавым, А. Красінай, Л. Перчуком. На аснове вывучэння і парагенетычнага аналізу складнікаў ільменагорскага комплексу была напісана кандыдацкая дысертацыя на тэму «Крышталічныя сланцы Ільменскіх гор і працэсы іх метасаматычнага змянення», якую Г. Г. Дамінікоўскі абараніў у 1967 г. у Свярдлоўску.

З ліпеня 1966 г. Глеб Георгіевіч працуе галоўным геолагам у тэматычнай партыі БГГЭ Упраўлення геалогіі пры СМ БССР, дзе прымае самы актыўны ўдзел у абагульненні і асэнсаванні фактычных матэрыялаў з мэтай пабудовы геафізычных і геалагічных карт крышталічнага фундамента цэнтральнай і заходняй часткі Беларускага масіву. Праца выконвалася ў цесным супрацоўніцтве з выдатнымі геолагамі Л. Матрунчыкам і У. Медушэўскай і завяршылася распрацоўкай асноваў стратыграфіі і картай часткі дакембрыйскага фундамента Беларусі. Гэта быў цікавы этап у вывучэнні геалогіі Беларусі: пачалося планамернае геалагічна-геафізічнае вывучэнне будовы крышталічнага фундамента рэспублікі.

З 1976 г. Глеб Георгіевіч стаў працаваць у Інстытуце геахіміі і геафізікі АН БССР на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка, але 10.10.1977 г. трагічна загінуў на працы пад Вільнюсам.

Глеб Георгіевіч Дамінікоўскі быў выдатным спецыялістам у галіне стратыграфіі, геалогіі, петраграфіі, мінералогіі, пошыку карысных выкапняў. Ён добра ведаў геалогію Украіны, Літвы, Латвіі і Эстоніі.

Вынікі вывучэння крышталічнага фундамента Беларусі Глебам Георгіевічам знайшлі сваё адлюстраванне ў 21 друкаванай працы, у тым ліку ў дзвюх манаграфіях: «Петрология докембрия Беларуси» (1978) і «Эволюция раннего докембрия» (1991) сумесна з Д. Дамінікоўскай, артыкулах: «Парагенетический анализ минеральных ассоциаций гнейсов Белорусского массива» (1968), «Стратиграфическое расчленение докембрийских образований Беларуси» (1970), «К вопросу геологического развития кристаллического фундамента западного региона Восточно-Европейской платформы» (1973) і інш.

У жыцці Глеб Георгіевіч быў жыццярадасным і вельмі адказным чалавекам, вылучаўся працавітасцю, прафесіяналізмам, глыбокай эрудыцыяй. Светлая памяць аб ім заўсёды застанецца ў сэрцах калег, жонкі, дзяцей, унукаў, усіх, хто яго ведаў.

*Д. А. Дамінікоўская, рэдкалегія*